УДК 172.15:316.64-075.875

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ І ІДЭНТЫЧНАСЦЬ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

**С. І. Міхайлаў**
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*
(e-mail: mikhaylovsi74@mail.ru)

**Анатацыя.** У артыкуле аналізуецца стаўленне студэнцкай моладзі да этнапедагагічных каштоўнасцей беларускага народа, а таксама ўзровень сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці і ідэнтычнасці.

**Ключавыя словы:** самасвядомасць, ідэнтычнасць, этнапедагагічныя каштоўнасці, нацыя, этнас.

# NATIONAL SELF-CONSCIOUSNESS AND IDENTITY OF STUDENT YOUTH

**S. I. Mikhailau**
*Vitebsk, VSU named P. M. Masherov*
(e-mail: mikhaylovsi74@mail.ru)

**Abstract.** The article analyzes the attitude of student youth to the ethnopedagogical values of the Belarusian people, as well as the level of formation of national self-consciousness and identity.

**Keywords:** self-consciousness, identity, ethnopedagogical values, nation, ethnos.

Глабальныя выклікі сучаснага свету патрабуюць дадатковай актывізацыі патрыятычнага выхавання на падмурку нацыянальна-культурных каштоўнасцей. Па сутнасці, памкненні апошніх дзесяцігоддзяў да глабалізацыі свету і мірнага суіснавання полікультурных асяродкаў церпяць паразу. Праблемы міграцыйнай палітыкі, існаванне нярэдка цалкам аўтаномных па нацыянальнай і рэлігійнай прыкмеце анклаваў (напрыклад, у шэрагу еўрапейскіх краін) не спрыяюць дзяржаўнай і грамадзянскай еднасці, становяцца прычынай міжнацыянальных і сацыяльных канфліктаў. Робіцца зразумелым, што без трывалага апірышча на нацыянальную ідэнтычнасць, усведамленне сябе “сынам свайго краю” немагчыма дасягненне згоды і еднасці ў грамадстве. У аснове патрыятычнага выхавання сучаснай беларускай моладзі такія складнікі, як мова, культура, традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, нацыянальныя і рэлігійныя святы, тэрытарыяльная прыналежнасць (у тым ліку канцэпт “малой радзімы”).

Мэта нашага даследавання – вызначыць стаўленне студэнцкай моладзі да этнапедагагічных каштоўнасцей беларускага народа, узровень

сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці і ідэнтычнасці, а таксама выпрацаваць практычныя рэкамендацыі па актывізацыі патрыятычнага выхавання ў студэнцкім асяродку.

**Матэрыял і метады.** У межах навукова-даследчага праекта БФФД "Развіццё нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў ва ўмовах рэгіянальнай ВНУ: гісторыка-этнапедагагічны аспект", які выконваецца на кафедры сацыяльна-педагагічнай работы факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі ВДУ імя П. М. Машэрава, намі была праведзена комплексная дыягностыка ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў факультэта шляхам прымянення шэрагу методык: анкетавання, накіраванага на вызначэнне ступені нацыянальнай тоеснасці (усведамленне сябе прадстаўніком пэўнай нацыі), апытальніка, што дазваліў ацаніць адносіны сучаснага пакалення студэнтаў да базавых этнапедагагічных каштоўнасцей беларускага народа, закрыта-адкрытай анкеты на веданне гісторыі і культуры Беларусі, экспрэс-апытальніка Г. У. Салдатавай на вызначэнне індэкса талерантнасці.

**Вынікі і іх абмеркаванне.**

Вывучэнне нацыянальнай самасвядомасці павінна пачынацца з вызначэння самога паняцця "свядомасць". Зыходзячы з дэфініцыі, прыведзенай у тлумачальным слоўніку беларускай мовы, самасвядомасць пераважна зводзіцца да разумення чалавекам самога сябе, сваёй ролі ў жыцці і ў грамадстве. Пры гэтым, чалавек, безумоўна, выступае не ў якасці пасіўнай адзінкі аб'ектыўнай рэальнасці, а ў якасці дзейнага, актыўнага суб'екта, які шмат у чым змяняе акаляючую рэчаіснасць, імкнецца прыўнесці сваё бачанне грамадскага быцця, свой набор аксіялагічных установак, поглядаў на свет і сваё месца ў ім. Даследаванне паняцця "самасвядомасць" бярэ пачатак яшчэ ў антычныя часы ў працах Сакрата і Платона, накіраваных на спасціжэнне прыроды і сутнасці чалавека, унутранага свету асобы. Старажытнагрэчаскія філосафы, па сутнасці, упершыню ў гісторыі еўрапейскага мыслення ўсвядомілі, што дасягненне гармоніі і дасканаласць чалавека заснаваны наператварэнні яго душы. У Сярэднявеччы спасціжэнне чалавекам самога сябе пераважна зводзілася да спасціжэння Бога (напрыклад, Фама Аквінскі). У традыцыях філасофіі Новага Часу (у асноўным, рацыяналізму і эмпірызму) самасвядомасць трактуецца як асабісты вопыт, асабістае бачанне самога сябе праз псіхалагічны складнік і ўнутранае інтравертнае пагружэнне і саманазіранне (Р. Дэкарт, Дж. Лок, Д. Юм і інш.). Але асабістая ацэнка самога сябе не ўсім філосафам здавалася правільнай і аб'ектыўнай. У прыватнасці, І. Кант паставіў пад сумнеў пазнавальную чалавечую здольнасць у працэсе самапазнання. Філосаф зыходзіў са складанасці ўзгаднення пазнавальнай, маральнай і эстэтычнай сутнасцей духоўнага жыцця чалавека. У шэрагу выпадкаў самасвядомасць падмяняцца самасузіраннем і самаперажываннем (Э. Гусерль). Канец XIX стагоддзя вызначаецца бліскучымі адкрыццямі ў сферы псіхааналізу (З. Фрэйд,

І. Брэер), у выніку чаго паняцце самасвядомасць пачынае сутыкацца з рэшткамі індывідуальных бессвядомых уяўленняў. У сучаснай філасофскай трактоўцы праблема самасвядомасці страчвае сваю адносную аўтаномнасць, г.зн. зніжаецца значнасць асабістага, "аўтарскага" разумення самога сябе, а ўсё большае значэнне набывае "шлях да сябе", заснаваны на сацыяльна значных узорах знешняга свету, усведамленне сябе ва ўсёй паўнаце і разнастайнасці грамадскіх і сацыяльных роляў. Іншымі словамі, чалавек усведамляе сябе больш у якасці адметнай асобы, чым звычайнага індывіда ў шэрагу аднастайных элементаў. Асабістая самасвядомасць шмат у чым пачынае дыктавацца знешняй свядомасцю, ды і самі паняцці "самасвядомасць" і "свядомасць" пачынаюць сціраць грань паміж сабой.

Нацыянальная свядомасць успрымаецца намі як набор ідэнтыфікацыйных рыс, якія вызначаюць нацыю, робяць яе адрознай ад іншых нацыянальных супольнасцей. У дадзены тэарэтычны канструкт намі ўключаюцца і тыповыя нацыянальныя перакананні, уяўленні, нацыянальна адметныя культурныя каноны, традыцыйныя выхаваўчыя мадэлі, скіраваныя на захаванне этнапедагагічных каштоўнасцей, пераемнасць пакаленняў, трывалае ўспрыманне аўтэнтычнасці і непаўторнасці сваёй нацыі, яе мовы, гісторыі і культуры. Нацыянальная свядомасць шмат у чым грунтуецца на больш вузкім паняцці "этнічнасць", пад якім разумеюць "успрыняцце сябе ў якасці прадстаўніка этнічнай групы і ўсведамленне сваёй адметнасці; наяўнасць пераемнай сувязі паміж пакаленнямі сваякоў, што з'яўляецца асновай для развіцця этнічнасці; уяўленні аб радзіме, духоўных каштоўнасцях, ідэалах; іх рэтрансляцыі праз веданне і выкарыстанне этнапедагагічных сродкаў выхавання" [1, с. 81]. "Нацыянальная свядомасць" і "этнічнасць" – паняцці блізкія, але, на нашу думку, не тоесныя, бо нацыя можа складацца з прадстаўнікоў розных этнасаў. І беларуская нацыя ў гэтым плане не выключэнне.

Даследаванне паказала, што пераважная большасць студэнтаў-рэспандэнтаў (89 %) ведаюць або часткова ведаюць народна-педагагічныя сродкі і метады выхавання, але пры гэтым толькі ў 19% апытаных сродкі і метады народнай педагогікі шырока прымяняліся пры іх асабістым выхаванні і толькі 32 % рэспандэнтаў у будучым адназначна гатовыя да выхавання сваіх дзяцей у адпаведнасці з народна-педагагічнымі традыцыямі і звычаямі беларускага народа, нягледзячы на тое, што амаль усе рэспандэнты (97 %) адзначылі, што цікавяцца традыцыямі і звычаямі беларускага народа. Ёсць падставы меркаваць, што ў гэтым выпадку назіраецца разыходжанне нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальнай тоеснасці рэспандэнтаў, іншымі словамі, таго, што яны думаюць пра сваю нацыю ў цэлым і таго, як яны ўспрымаюць асабіста сябе ў якасці прадстаўніка гэтай нацыі, "прымяраючы" тыя або іншыя нацыянальна-культурныя каштоўнасці непасрэдна на сябе. У шырокім разуменні прысутнічае пэўны дысананс паміж свядомасцю і самасвядомасцю,

установкі могуць не заўсёды супадаць з паводзінамі. Разам з тым, пры аналізе адносін студэнтаў да разнастайных этнакаштоўнасцей беларускага народа (праца, любоў да Радзімы, гонар за сваю сям'ю, міжпакаленная сувязь, родная мова, усведамленне прыроды як часткі малой радзімы, гасціннасць, сумленнасць, спагада і інш.) выяўляецца выразная тэндэнцыя да больш істотнага ўспрымання іх студэнтамі ў якасці асабістых уласцівасцей ("характэрна для мяне") ці значных у перспектыве ("неабходна будучым пакаленням"). Пры гэтым студэнты, як правіла, лічаць, што згаданыя вышэй каштоўнасці не ў поўнай меры ўласцівы сучаснаму грамадству ("характэрна для сучаснага соцыуму").

Так, "прадстаўнікі любога этнасу ўсведамляюць сваю адметнасць у параўнанні з прадстаўнікамі іншых этнічных калектываў, і гэта ўсведамленне выяўляюць у непаўторных паводзінах (г.зн. светаўспрыманні і бачанні сябе, сваёй ролі ў гэтым свеце), у традыцыях і звычаях, і нарэшце, у легендах і паданнях, казках, прыказках і прымаўках, г.зн. у мове, якая ўяўляе сабой адну з праяў этнічнай арыгінальнасці" [2, с. 47]. Таму яскравым бачыцца стаўленне студэнтаў да такой нацыянальнай каштоўнасці, як родная мова. Больш за 90 % студэнтаў выказваюцца за значнасць роднай мовы падчас камунікацыі: 81 % з іх падкрэслівае значнасць роднай мовы ў грамадскіх стасунках, 11 % рэспандэнтаў размаўляюць на ёй з блізкім асяроддзем. Дададзім да гэтага і той факт, што ў 62 % выпадкаў студэнты ацанілі даволі высокім балам неабходнасць ведання роднай мовы будучымі пакаленнямі. Цікавай таксама выяўляецца суаднесенасць моўнага і культурнага складнікаў у якасці прымет, на падставе якіх адбываецца атаясамліванне чалавека з нацыяй: крыху больш за палову рэспандэнтаў (51 %) лічаць веданне культуры свайго народа і любоў да яе галоўным чыннікам успрымання чалавека як прадстаўніка пэўнай нацыі, 41 % рэспандэнтаў выказаліся за раўназначна важнае значэнне моўных і культурных прымет у нацыянальным вызначэнні чалавека.

Анкета па гісторыі і культуры Беларусі была скіравана на праверку ведання студэнтамі знакавых нацыянальных "маркераў" беларусаў у сферы гісторыі, літаратуры, мастацтва, фальклору, народных свят і абрадаў, страў і г.д. Яе аналіз паказаў, што ўсе рэспандэнты без выключэння падтрымліваюць неабходнасць ведання гісторыі Беларусі, заяўляючы, напрыклад, што "без яе ведання страчваецца значнасць нацыі, паўтараюцца памылкі мінулага, забываюцца подзвігі памерлых". Сярод найбольш вядомых беларускіх асветнікаў студэнты пераважна адзначаюць Е. Полацкую, К. Тураўскага, Ф. Скарыну, С. Буднага, С. Полацкага, сярод класікаў беларускай літаратуры к. XIX-пач. XX ст. згадваюць Я. Купалу, Я. Коласа, З. Бядулю, М. Багдановіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Пашкевіч (Цётка), сярод вядомых мастакоў Віцебскай школы – Ю. Пэна, К. Малевіча, М. Шагала, З. Азгура. Толькі 5 рэспандэнтаў (13 %) аказаліся не ў стане прывесці некалькі беларускіх прыказак (прымавак), народных казак, 3 рэспандэнты (8 %) не здолелі назваць вядомых беларускіх асветнікаў мінулага, 2 студэнты

(5,5 %) не ведалі, што менавіта М. Багдановіч пісаў пра слуцкія паясы. Таксама ў 6 рэспандэнтаў (16 %) назіралася змяшэнне часавых межаў пры згадванні беларускіх пісьменнікаў к. XIX – пач. XX ст., калі да іх ліку былі аднесены, напрыклад, У. Караткевіч, Р. Барадулін, Н. Гілевіч, В. Быкаў, А. Куляшоў, І. Мележ і нават С. Будны. Разам з тым, студэнты прывялі досыць шырокі спектр народных святаў і абрадаў (Масленіца, Каляды, Купалле, Дзяды і інш.), нацыянальных беларускіх страў (дранікі, калдуны, бабка, клёцкі, верашчака і інш.).

**Заключэнне.** Даследаванне паказала, што студэнтам факультэта ўласцівы даволі высокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці і ідэнтычнасці ў кантэксце ведаў і ўстановак, але далёка не заўсёды яны пераходзяць на ўзровень асабістых паводзін. Лічу, у вучэбных праграмах ВНУ быў бы карысным спецыялізаваны курс, які б уключаў гістарычны, лінгвістычны, літаратуразнаўчы, этнапедагагічны і валеалагічны вучэбныя і этнакультурныя кампаненты.

Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Міхайлава, А. Л. Дыягнаставанне ступені этнічнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы як перадумовы іх паспяховай прафесійнай дзейнасці (на прыкладзе Віцебскага рэгіена) / А. Л. Міхайлава // Веснік Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. – 2018. – № 4. – С. 79–84. – Рэжым доступу: https://rep.vsu.by/handle/123456789/17362. Дата доступу: 16.09.2024.
2. Міхайлава, А. Л. Этнапедагагічная падрыхтоўка спецыялістаў сацыяльнай сферы ва ўмовах полікультурнага соцыуму: тэарэтыка-метадалагічны аспект : манаграфія / А. Л. Міхайлава. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2018. – 157 с. – Рэжым доступу: https://rep.vsu.by/handle/123456789/17417. Дата доступу: 16.09.2024.



*Исследование по теме «Формирование национального самосознания студентов в условиях регионального вуза: историко-этнопедагогический аспект» проводится в рамках поддержки БРФФИ (договор № Г23ИП-017 от 02.05.2023 г.).*



**УДК 316.647.5:323.11:159.923.2:172.15**


# ЭТНИЧЕСКАЯ ТОЛЕРАНТНОСТЬ КАК СОСТАВЛЯЮЩАЯ НАЦИОНАЛЬНОГО САМОСОЗНАНИЯ


**Т. В. Савицкая**
*Витебск, ВГУ имени П. М. Машерова*
(e-mail: statv2017@yandex.by)



**Аннотация.** Этническая толерантность в статье рассматривается как составляющая национального самосознания, как средство, способствующее духовному самосовершенствованию личности. Формирование этнической